# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 4 снежня 1997 года, чацвер, № 16 (1771)


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Наш універсітэт ізноў пацвярджае, што ён з'яўляецца буйным навуковым цэнтрам Беларусі. Апошнім часам на базе БДУ адбыліся навуковыя міжнародныя канферэнцыі "Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя" і "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай". А з 8 па 11 снежня пройдзе канферэнцыя "Камп'ютэрная алгебра ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях і адукацыі. CAS-97"

Стар. 2

З пераходам Беларусі да рынкавых адносінаў перад нацыянальцтвам рэспублікі паўстала праблема занятасці і працаўладкавання. Яна не абышла і моладзь. Матэрыял, прысвечаны "Дню кар'еры", чытайце ў нумары

Стар. 3

Ужо знаёмая чытачам "Беларускага універсітэта" старонка мастацкай творчасці "Майстроўня"

Стар. 4


Новыя тэхналогіі

# Internet — у шырокія масы

У межах праекта ўрада Рэспублікі Беларусь "Узмацненне нацыянальнай інфармацыйнай і камунікацыйнай інфраструктуры ў мэтах узмацнення дэмакратычных рэформаў, удасканальвання кіравання дзяржавай і развіцця рынкавых рэформаў" выконваецца шэраг праграмаў з рознымі арганізацыямі. Адна з іх рэалізуецца сумесна універсітэтам і прадстаўніцтвам ААН/ПРААН у Рэспубліцы Беларусь. Праект называецца "Стварэнне вучэбнага цэнтра БДУ і арганізацыя навучання работнікаў сацыяльнай сферы, грамадскіх арганізацыяў і навучэнскай моладзі тэхналогіям Internet" (скарочана Internet Беларусь). З нагоды падпісання пагаднення паміж універсітэтам і ААН/ПРААН з выканаўчым дырэктарам праекта *Юрыем Іосіфавічам Варатніцкім* гутарыць карэспандэнт "Беларускага універсітэта".

— Сёння ў рэспубліцы дастаткова інтэнсіўна развіваецца камунікацыйная інфраструктура. Звязана гэта з тым, што ўсё большай колькасці навуковых супрацоўнікаў, педагогаў, спецыялістаў розных сфераў дзейнасці неабходны доступ да рэсурсаў міжнароднай глабальнай сеткі Internet. Зроблена ўжо нямала. У Мінску створана апорнае оптавалаконнае кола, якое мае доступ да Internet праз рэспубліканскую сетку Белпак. Да яго ўжо сёння падключаны дзесяткі розных арганізацыяў. Хуткае нарошчванне ліку карыстальнікаў Internet і вялікай колькасці патэнцыяльных кліентаў выклікае праблему іх падрыхтоўкі. Доступ у Internet хацелі б атрымаць не толькі тыя, хто працуе ў галіне інфарматыкі і камп'ютэрнай тэхнікі, але і вялікая колькасць людзей, якія маюць гуманітарную адукацыю. Ствараемы вучэбны цэнтр павінен вырашыць задачу навучання.

*— Чаму ж ён паявіўся менавіта ва універсітэце?*

— Зусім не выпадкова. На сённяшні дзень універсітэт з'яўляецца найбольш "пасунутай" ВНУ рэспублікі ў сферы стварэння камунікацыйнай сеткавай інфраструктуры. Ужо зараз поўным ходам вядуцца работы па стварэнню цэласнай оптавалаконнай сеткі ва універсітэце. У яе аб'яднаныя ўжо ўсе карпусы універсітэцкага гарадка. Гэта некалькі сотняў працоўных станцыяў. Іншыя ВНУ такой інфраструктуры пакуль не маюць.

*— На якіх прынцыпах будзе пабудаваная праца цэнтра: ці прадугледжваецца адбор кандыдатаў у навучэнцы, ці будуць паслугі цэнтра платнымі?*

— Увогуле гэты праект не з'яўляецца камерцыйным, хаця прадугледжваецца, што нейкую частку сродкаў на пакрыццё выдаткаў ён павінен зарабляць. Выдаткаў шмат, пачынаючы з таго, што давядзецца ўдасканальваць абсталяванне, бо камп'ютэрная тэхніка не стаіць на месцы. Наступныя артыкулы выдаткаў — зарплаты выкладчыкаў і рэклама. Але ў цэлым гэты праект з'арыентаваны на бясплатнае навучанне работнікаў пералічаных сфераў. Будзе і адбор. Таму што прадстаўніцтва ААН/ПРААН, як і іншыя міжнародныя грамадскія арганізацыі, ужо праводзіла шэраг конкурсаў на выдзяленне грантаў на падключэнне розных карыстальнікаў да Internet. У першую чаргу мы будзем працаваць менавіта з імі.

*— А з універсітэцкімі супрацоўнікамі, аспірантамі, студэнтамі?*

— Зразумела. Гэта ж адна з першачарговых задачаў цэнтра. Спачатку мы будзем арыентавацца на выкладчыкаў.

Таму што, маючы у цэнтры пятнаццаць камп'ютэраў, мы не можам прадаставіць такую магчымасць усім жадаючым. Праблему навучання тэхналогіям Internet усіх студэнтаў і аспірантаў можна вырашаць, толькі перагледзеўшы універсітэцкія навучальныя праграмы ў галіне інфарматыкі і камп'ютэрнай тэхнікі на ўсіх факультэтах. І ў першую чаргу на тых, дзе гэтую дысцыпліну прынята лічыць непрафілюючай, дзе камп'ютэрная тэхніка вывучаецца толькі як сродак для працы. Думаю, што хутка мы прыйдзем да таго, што неабходна выпрацаваць навучальны стандарт універсітэта ў галіне інфарматыкі, што зробіць немагчымым выхад за сцены універсітэта спецыяліста, які не ў стане валодаць сучаснымі сродкамі інфарматызацыі, праводзіць інфармацыйны пошук у глабальных камп'ютэрных сетках. Тым больш, што зараз рэктарат стварыў усе перадумовы, каб рэалізаваць падобныя ідэі. Толькі за апошні навучальны год (1996-1997) факультэты універсітэта атрымалі каля 200 персанальных камп'ютэраў, аб'яднаных у сеткавыя класы.

*— Ці хутка ваш цэнтр наведаюць першыя навучэнцы?*

— Увогуле, мы пачалі працаваць яшчэ да афіцыйнага падпісання дакумента — як толькі атрымалі абсталяванне. За кошт універсітэта былі выкананыя работы па рамонту памяшкання, закуплена мэбля, выкананая ўстаноўка камп'ютэраў. Супрацоўнікамі цэнтра інфармацыйных тэхналогіяў былі распрацаваныя вучэбныя планы. А на яго базе сумесна з Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы прайшла школа-семінар "Сучасныя інфармацыйныя сістэмы і адукацыя".

*Марына АВЕРКІНА*

Самакіраванне

# Што можа студсавет

У студэнцкім савеце, членам якога я з'яўляюся, ідзе мэтанакіраваная работа па паляпшэнню і ўпарадкаванню пражывання іншагародніх студэнтаў у інтэрнаце. Тут жыве каля 1000 навучэнцаў. Вырашэнне сацыяльна-бытавых пытанняў ім адным наўрад ці пад сілу. Таму мы падумалі, што зрушыць з мёртвай кропкі можна, толькі злучыўшы намаганні і магчымасці адміністрацыі БДУ, прадстаўнікоў факультэтаў і студсавета.

А праблемаў у нас шмат — ад недахопу канцтавараў да пастаянных перабояў з вадой на верхніх паверхах інтэрната. Усе яны абмяркоўваліся на "круглым стале", праведзеным студэнцкім саветам другога інтэрната. Апрача таго, мы вельмі хацелі бліжэй пазнаёміцца з нашым новым кіраўніцтвам і заявіць аб сабе як аб органе, які рэальна дзейнічае і паўнацэнна працуе.

Нашая напружаная работа не прайшла марна: па многіх пунктах распрацаванай рэзалюцыі мы атрымалі станоўчыя адказы. І ўжо зараз відаць вынікі нашай працы: адбылося абсталяванне пакояў грамадскага карыстання, дэканы факультэтаў выдзелілі фінансавую дапамогу для закупкі канцтавараў. Рэктар БДУ паабяцаў дапамагчы з музычнай апаратурай і кухоннымі плітамі, якія не мяняліся ўжо больш за 20 гадоў (у выніку — 5 канфорак абслугоўваюць 88 чалавек на паверсе). Асабліва радуюцца студэнты фізічнага факультэта, бо ў іх нарэшце з'явіцца вада.

Канешне, не па ўсіх пытаннях нам змаглі дапамагчы, але за ўсім адразу не паспееш. Галоўнае не колькасць, а якасць. Мы не збіраемся спыняцца на дасягнутым і будзем імкнуцца самі ўвасабляць ў жыццё нашыя ідэі і жаданні. Але толькі ў саюзе з адміністрацыяй мы маем моц, толькі ў гэтым выпадку наша праца будзе даваць чаканы плён.

*Наталля ЖЛОБА,*
*студэнтка*
*факультэта*
*журналістыкі*

Постфактум

# Моладзь — ветэранам

24 лістапада ў Мінску адбыўся Усебеларускі актыў БПСМ, на якім разглядаліся першыя вынікі працы гэтай новай маладзёжнай арганізацыі. Перад удзельнікамі актыву выступіў прэзідэнт Беларусі А.Р. Лукашэнка.

Сярод мерапрыемстваў гэтай арганізацыі вылучаецца акцыя "Моладзь — ветэранам", у якой актыўны ўдзел прыняў камітэт БПСМ Белдзяржуніверсітэта. Так, 29 кастрычніка члены Саюза выязджалі ў саўгас "Дрычынскі" Пухавіцкага раёна на нарыхтоўку капусты: усяго было сабрана пяць тон, перададзеных пажылым людзям.

*П. СКАЛАБАН,*
*сакратар*
*камітэта БПСМ*
*Беларускага*
*дзяржаўнага*
*універсітэта*

Дошка аб'яў

# Еўрапейскі Саюз: гісторыя, палітыка, эканоміка, права

17-18 снежня на базе Белдзяржуніверсітэта пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Еўрапейскі Саюз: гісторыя, палітыка, эканоміка, права".

Яе праводзіць Цэнтр Еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі нашага універсітэта. У семінары возьмуць удзел навукоўцы і спецыялісты, якія працуюць у галіне міжнародных зносінаў і міжнароднага права, еўрапейскай інтэграцыі, супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і дзяржаваў-членаў ЕС у розных сферах. У межах канферэнцыі будуць працаваць секцыі:

— станаўленне і развіццё Еўрапейскага Саюза: гісторыя і сучаснасць;

— еўрапейскія эканамічныя сувязі: праблемы і новыя рашэнні;

— міжнародна-прававыя асновы дзейнасці ЕС.

**Па выніках канферэнцыі плануецца выданне яе матэрыялаў на рускай і англійскай мовах.**

# Падпіска- 98

**Працягваецца падпіска на газеты і часопісы на першае паўгоддзе 1998 года.**

**Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях выглядае так:**

**Серыя I (індэкс 74851)** — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень, № 2, май) — 40 000 рублёў;

**Серыя II (індэкс 74852)** — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты, № 2, чэрвень) — 40 000 рублёў;

**Серыя III (індэкс 74853)** — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік) — 20 000 рублёў;

**Серыя IV (індэкс 74854)** — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 1, красавік) — 20 000 рублёў.

Падпіска на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь да 15 снежня.

**Нагадваем, што ў рознічны продаж часопіс не паступае.**

# CAS-97:

## Беларусь упершыню праводзіць міжнародную канферэнцыю

З 8 па 11 снежня ў Мінску на базе Белдзяржуніверсітэта пройдзе Міжнародная навуковая канферэнцыя "Камп'ютэрная алгебра ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях і адукацыі. CAS-97", арганізаваная Міністэрствам адукацыі РБ, Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміяй. Нягледзячы на ўжо даволі багатую гісторыю існавання, распрацоўкі і прымяненне сістэмаў камп'тэрнай матэматыкі ў свеце і (можа быць, у меншай ступені) у краінах былога Савецкага Саюза міжнародная канферэнцыя, поўнасцю прысвечаная гэтаму накірунку ў навуцы, праводзіцца ў нашай рэспубліцы ўпершыню.

Такія сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі, як DERIVE, REDUCE, MATHCAD, MAPLE, MATHEMATICA і інш., з рознай інтэнсіўнасцю выкарыстоўваюцца некаторымі студэнтамі і выкладчыкамі нашых ВНУ і проста энтузіястамі для рашэння складаных і грувасткіх матэматычных задачаў або мадэлявання працэсаў з іншых галінаў навукі. Гэта дазваляе выказаць меркаванне аб з'яўленні пэўнай цікавасці да канферэнцыі з іх боку, што, вядома ж, будзе толькі вітацца. У апошнія гады ў айчынных карыстальнікаў з'явілася болей магчымасцяў для працы з падобнымі праграмамі і пакетамі (калі так можна сказаць пра даступныя, але почасту непаўнацэнныя пірацкія копіі), і цяпер асноўныя задачы ў гэтай сферы зрушыліся ў бок пошуку інфармацыі аб наяўных праграмах і іх мажлівасцях, кіраўніцтваў і дакументацыі. Правядзенне канферэнцыі дапаможа часткова вырашыць гэтыя праблемы: у дні работы CAS-97 будзе праводзіцца выстава "Інфармацыйныя тэхналогіі ў навучанні і кіраванні навучальнымі ўстановамі", на якой плануецца прадставіць існуючыя ў свеце праграмныя прадукты з галіны камп'ютэрнай матэматыкі і літаратуру аб іх. Хаця, канешне, засілле пірацтва падобнага маштабу на рынку праграмнага забеспячэння нікому (тым больш арганізатарам міжнароднай канферэнцыі) гонару не робіць.

Матэрыялы, якія трапілі на канферэнцыю з ЗША, Германіі, Кітая і краін СНД, падзеленыя на пяць секцыяў: "Тэорыі сучасных СКА і пакеты прыкладных праграмаў на іх аснове", "Прымяненне СКА ў матэматыцы і эканоміцы", "Прымяненне СКА ў механіцы", "Прымяненне СКА ў фізіцы", "СКА ў адукацыі",— паседжанні па якіх адбудуцца 9 і 10 снежня. Апрача таго, 6, 8 і 11 снежня пройдуць лекцыі нямецкага прафесара Роберта Краглера, прысвечаныя сістэме камп'ютэрнай алгебры *Mathematica*.

Дарэчы, Роберт Краглер як старшыня міжнароднага камітэта канферэнцыі аказаў неацэнную дапамогу ў яе арганізацыі. У многім дзякуючы зробленай спадаром Краглерам працы ў выставе канферэнцыі будзе прадстаўленая літаратура ад амерыканскай кампаніі Wolfram Research – стваральніка сістэмы *Mathematica*.

У ліку членаў міжнароднага камітэта канферэнцыі ёсць і былы супрацоўнік Белдзяржуніверсітэта, а зараз адзін з вядучых распрацоўшчыкаў кампаніі Wolfram Research Віктар Адамчык; прафесар Калумбійскага універсітэта (ЗША) Гаўтам Дасгупта; прафесар Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў (Дубна, Расія) Уладзімір Гердт.

Правядзенне канферэнцыі такога ўзроўню, спадзяемся, дазволіць прыцягнуць большую ўвагу да жыццёвай неабходнасці тэрміновага асваення найноўшых інфармацыйных тэхналогіяў у адукацыйных працэсах ВНУ нашай рэспублікі, а таксама стане добрай асновай для далейшага супрацоўніцтва з замежнымі калегамі.

*Аргкамітэт канферэнцыі*



# Перазовы ў вопыце чалавецтва

*18-20 лістапада ва універсітэце прайшла III-я міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай". У праграме было заяўлена больш як 150 выступленняў.*

Адкрывалі каферэнцыю прарэктар БДУ, доктар гістарычных навук П.І.Брыгадзін і дэкан філалагічнага факультэта Л.А.Мурына. Вялі рэй старшыня аргкамітэта, акадэмік АН Еўразіі В.П.Рагойша і член-карэспандэнт НАН Беларусі А.А.Лойка.

Вядома, як важна сёння па-сучаснаму, навукова-карэктна ўбачыць надзвычай драматычныя шляхі развіцця славянскіх літаратур, ацаніць той духоўны вопыт, які ў гэтых літаратурах захаваны. Важна яшчэ і абгрунтавана змясціць славяншчыну ў сусветны кантэкст, а таксама неабходна апрабаваць аўтарытэтную ў свеце навуковую метадалогію — традыцыйную і самую новую. Гэтыя навуковыя задачы найперш і вырашаліся на канферэнцыі.

Цікавымі былі выступленні гасцей, сярод якіх — Ёзэф Сіпка з Прэшава, Сівілья Семакова з Браціславы, Гардана Стойкаўска са Скоп'е і іншыя. Натуральна, найбольш прадстаўнічымі былі шэрагі айчынных навукоўцаў. Сярод іх — такія вядомыя знаўцы беларускай, рускай, польскай, украінскай, чэшскай, сербскай, а таксама заходнееўрапейскіх літаратур, як А.Станюта, М.Мішчанчук, Т.Шамякіна, Л.Тарасюк, П.Ткачоў, І.Скарапанава, С.Мусіенка, Т.Кабржыцкая, І.Шаблоўская, І.Чарота, Е.Лявонава, Г.Сініла. Толькі ў персаналіях у дакладах удзельнікаў канферэнцыі прагучалі таксама імёны творцаў літаратураў славацкай, балгарскай, македонскай, грузінскай, эстонскай, швейцарскай, лацінаамерыканскай, італьянскай, англійскай, французскай, ірландскай, нямецкай, нарвежскай і іншых. Прадметам асобнай зацікаўленасці сталі індаеўрапейскія пласты, біблейскія матывы, кантамінацыі розных стылёвых эпох у лёсах славянскіх літаратур.

У свеце нярэдка так здараецца, што літаратурная традыцыя развіваецца на іншанацыянальнай мове. Вялікую цікавасць ва ўзельнікаў канферэнцыі выклікалі падобныя перыяды ў гісторыі беларускай літаратуры. Гэта з'явы беларуска-польскага, беларуска-рускага памежжа, факты, звязаныя з лацінамоўнай беларускай літаратурнай традыцыяй. Цікавымі на канферэнцыі былі і традыцыйныя кампаратывісцкія даследаванні, і ўзоры ў рэчышчы гістарычнай паэтыкі, і фенаменалагічныя росшукі, і вопыты наратыўнага прачытання літаратурнага тэксту.

Канферэнцыя яшчэ раз угрунтавала тую ісціну, што ўсе славянскія літаратуры, кожная ў свой час і па-свойму, арганічна звязаныя з сусветнай культурай. Таму адлюстроўваюцца адно ў адным Джавані Бакача і Уршуля Радзівіл, Алесь Гарун і Уільям Йейтс, Павіч і Борхес, Жылка і Бадлер, Пушкін і Шаўчэнка, Гарэцкі і Гамсун, Уайльд і Дастаеўскі, Адам Міцкевіч і Якуб Колас, Суінберн і Бальмонт, Белы і Блок, Стопард і Главацкі, Максім Багдановіч і Леся Украінка, Караткевіч і Аляксей Талстой, Быкаў і Рамен Гары, Гейне і Цютчаў, Густаў Герлінг-Гудзінскі і Варлам Шаламаў, Хвылявы і Мрый... Сапраўды, няма нічога ў свеце культуры — і ў свеце беларускай літаратуры,— што б не мела водгуку, перазоваў ва універсальным вопыце чалавецтва.

*Л. С.*



# Якой быць мове будучага?

Не так даўно ва універсітэце адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя". У сваёй рэзалюцыі яе ўдзельнікі адзначаюць, што ў дакладах былі ўзняты і абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця беларускай мовы, а таксама яе сучасны стан у грамадстве. Атмасфера канферэнцыі вызначалася высокім навуковым узроўнем, уважлівымі і карэктнымі адносінамі да розных, часам процілеглых поглядаў на тыя ці іншыя праблемы сучаснага стану беларускай мовы і асаблівасцей яе функцыяніравання ў грамадстве, канструктыўнасцю абмеркавання і прапаноў. Канферэнцыя зазначыла высокі патэнцыял беларускіх мовазнаўцаў, што дазваляе паспяхова вырашыць многія складаныя і супярэчлівыя праблемы сучаснага моўнага жыцця ў рэспубліцы, а таксама прыступіць да планамернага абнаўлення падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове з улікам тых змен, што адбыліся ў структурным развіцці беларускай мовы ў другой палове XX стагоддзя, у характары моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь і статусе беларускай мовы як мовы тытульнай нацыі.

Удзельнікі звярнулі ўвагу на тое, што ў апошні час, асабліва пасля майскага 1995 года рэферэндума і канстытуцыйнага замацавання дзяржаўнага двухмоўя ў Рэспубліцы Беларусь з боку вышэйшых органаў дзяржаўнага кіравання назіраецца неабгрунтаванае аслабленне ўвагі да праблем функцыяніравання беларускай мовы ў грамадстве, павышэння яе ролі як дзяржаўнай мовы і мовы тытульнай нацыі ў важнейшых сферах грамадскіх зносін, у першую чаргу, у сферы справаводства, дзяржаўнага кіравання, адукацыі і навукі. У сувязі з гэтым сёння, як ніколі, беларуская мова зноў патрабуе падтрымкі на дзяржаўным узроўні, паколькі належны ўзровень выкарыстання мовы тытульнай нацыі ў важнейшых сферах зносін, у тым ліку і міждзяржаўных, будзе самым непасрэдным чынам спрыяць міжнароднаму прэстыжу Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы ў сусветным супольніцтве, а таксама садзейнічаць уваходжанню арыгінальнай беларускай культуры ў сусветную культуру. Таму праца над новым варыянтам "Закона аб мовах" павінна суправаджацца распрацоўкай праграмы канкрэтных мерапрыемстваў, скіраваных на тое, каб беларуская мова на самай справе заняла ў жыцці грамадства дэкларавана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь месца.

Удзельнікі канферэнцыі вырашылі:

1. Практыкаваць рэгулярнае правядзенне навуковых канферэнцый па актуальных праблемах развіцця сучаснай беларускай мовы (не радзей аднаго разу ў два гады);

2. Арганізаваць правядзенне міжкафедральных семінараў па асобных актуальных праблемах сучаснага беларускага мовазнаўства;

3. З мэтай паспяховага абмеркавання пытанняў нармалізацыі сучаснай беларускай мовы і больш шырокага азнаямлення лінгвістычных колаў з праблемай і дасягненнямі беларускага мовазнаўства наладжваць і ўзмацняць кантакты з мовазнаўцамі-беларусістамі блізкага замежжа;

4. Звярнуць увагу на недапушчальнасць грубых адхіленняў ад норм беларускай мовы ў сродках інфармацыі і ў першую чаргу радыё і тэлебачання. Звярнуцца ў Камітэт па радыё і тэлебачанні з прапановай правесці круглы стол па абмеркаванню культуры вуснай мовы ў гэтай уплывовай сферы;

5. З мэтай актуалізацыі навуковага даследавання сучасных праблем беларускага мовазнаўства прыняць захады па стварэнню цэнтралізаванага банка тэматыкі і доктарскіх даследванняў па беларускай мове;

6. З мэтай прыцягнення ўвагі дзяржаўных органаў кіравання да надзённых праблем развіцця і функцыяніравання беларускай мовы ў сучасных умовах ад імя ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуцца ў адпаведныя дзяржаўныя структуры (у першую чаргу Міністэрства адукацыі) з канкрэтнымі прапановамі па гэтай праблеме;

7. Звярнуць увагу на неабходнасць канцэнтрацыі ўвагі мовазнаўцаў і выкладчыкаў на актуальных праблемах методыкі выкладання беларускай мовы на розных узроўнях навучання з улікам змен, што адбыліся ў беларускай мове і моўнай сітуацыі ў Беларусі ў канцы XX стагоддзя.

*Аргкамітэт канферэнцыі*



# Утаймавальнікі стыхіі

Пажарныя апошнім часам не толькі ўтаймоўваюць агонь. Усё часцей і часцей яны праводзяць выратавальныя аперацыі пры транспартных аварыях, катастрофах і іншых надзвычайных сітуацыях. У мінулым такое здаралася не раз. Дастаткова прыгадаць выбухі цэха радыёфутаралаў і катастрофу на Мінскай газанапаўняльнай станцыі ў 1972 годзе.

У 1996 годзе на ліквідацыю надзвычайных сітуацыяў пажарныя выязджалі 365 разоў, а за 9 месяцаў бягучага года — ужо 299 разоў. І гэта не дзіўна. Сталіца — буйны прамысловы цэнтр і транспартны вузел краіны. Тут сканцэнтраваныя прадпрыемствы самага рознага профілю, у тым ліку і патэнцыйна небяспечныя. Тэхналагічныя лініі і абсталяванне пастаянна старэюць, не выконваюцца рэгламентныя рамонтна-аднаўленчыя работы. Лік сітуацыяў, якія ўяўляюць пагрозу жыццю людзей, непазбежна расце.

Што ж робіцца ў горадзе для мінімізацыі магчымых наступстваў аварыяў і катастрофаў? Пры Мінгарвыканкаме і адміністрацыях раёнаў існуюць надзвычайныя камісіі. Быў распрацаваны і зацверджаны шэраг дакументаў і інструкцыяў па ліквідацыі разнастайных надзвычайных сітуацыяў. Здавалася б, дакументальна вызначана, хто і чым павінен займацца, аднак жыццё паказвае, што наша служба прыходзіць на дапамогу першай, часта ваюючы ў адзіночку ў найскладанейшых сітуацыях.

На працягу апошніх гадоў нярэдка адбываліся аварыі і здарэнні на чыгуначнай станцыі "Мінск-сартавальны". У выніку сутыкнення цыстэрнаў адбывалася разліванне змесціва: сернай кіслаты, бензіну, мазуту, іншых хімічна небяспечных рэчываў. Да ліквідацыі такіх сітуацыяў не падрыхтаваныя ні чыгунка, ні іншыя фармаванні.

На рахунку пажарнікаў сталіцы — дзесяткі яскравых перамог над тэхнагеннымі аварыямі: пажарамі на мінскіх ЦЭЦ, выбухам на заводзе аўтаматычных ліній, уцечкамі аміяку і хлору...

Практыка паказала, што для збірання ўсіх сілаў і сродкаў, неабходных для ліквідацыі той ці іншай надзвычайнай сітуацыі, патрабуецца час. Так, у 1972 годзе пры ліквідацыі наступстваў выбуху на заводзе радыёфутаралаў сілы грамадзянскай абароны прыбылі толькі праз 6-7 гадзінаў.

Разумеючы ўсю адказнасць, якая ляжыць на нас, і ведаючы, што дадатковая дапамога прыбудзе не дужа хутка, мы стараемся пераўтварыць сваю службу ў аператыўную і найбольш мабільную, накшталт "911", што існуе ў ЗША. Асноўная ўвага надаецца вывучцы пажарных, уменню дзейнічаць у экстрэмальных сітуацыях. Пастаянныя трэніроўкі і вучэнні, тэарэтычная падрыхтоўка — вось складнікі поспеху і дасягнення станоўчых вынікаў. Сёння пажарныя праходзяць курс аказання першай даўрачэбнай дапамогі: зрабіць штучнае дыханне, накласці шыну на пералом ужо не падаецца праблемай для прафесіяналаў.

Знайшлі мы падтрымку і разуменне з боку ўладаў горада. У рамках прынятай гарадской праграмы па прадухіленню гібелі і траўматызму людзей на пажарах на будучы год з гарадскога бюджэта выдзелілі сродкі на набыццё двух аўтамабіляў хуткага рэагавання і адной 50-метровай аўталесвіцы, так неабходных пажарным-выратавальнікам. Узаемаразуменне склалася і з кіраўнікамі адміністрацыяў Кастрычніцкага, Маскоўскага і Ленінскага раёнаў.

У справе ўтаймавання агню пажарная служба ўсё часцей звяртаецца да найноўшых распрацовак. Разам з прадпрыемствам "Форд-Юніён" плануецца распрацоўка і выпуск аўтамабіля хуткага рэагавання. Намаганнямі беларускай навукі і вытворчасці былі створаныя такія эфектыўныя сродкі барацьбы з пажарамі, як новы пенаўтваральнік, устаноўка імпульснага гашэння "Волна". Аднак для іх маштабнага выкарыстання патрабуюцца немалыя сродкі.

Ёсць і іншыя праблемы. Адна з іх — стварэнне непасрэдна на прадпрыемствах умоваў для паспяховай ліквідацыі разнастайных надзвычайных сітуацыяў. Пастаянны галаўны боль у пажарных выклікае і супроцьпажарны стан буйных аўтагаспадарак горада, дзе назіраецца тэндэнцыя ігнараваць патрабаванні службы дзяржаўнага пажарнага нагляду. Як паказалі начныя праверкі гэтых аб'ектаў, тут зусім не выконваецца вызначаны нарматывамі парадак расстаноўкі аўтатэхнікі, што пры магчымым пажары прывядзе да велізарных матэрыяльных стратаў. Не поўнасцю вырашылі і праблему гашэння пажараў у рэзервуарах захоўвання нафтапрадуктаў на мінскіх ЦЭЦ і нафтабазах.

Такіх прыкладаў можна прыводзіць сотні. І за кожным з іх стаіць пагроза жыццю і здароўю тысячаў людзей, захаванню прамысловага патэнцыялу. Таму пажарныя на ўсіх узроўнях ставяць пытанне аб распрацоўцы дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацыяў. А пакуль пажарная служба стаіць на ахове бяспекі людзей. Яскравае пацверджанне гэтаму — свежыя прыклады ўтаймавання стыхіі, выкліканай аварыямі на чыгуначнай станцыі ў Барысаве і нафтабазе пасёлка Фаніпаль.

*Барыс БАРЫНГОЛЬЦ, начальнік упраўлення пажарнай службы г.Мінска*

# Дзень кар'еры

З пераходам Беларусі да рыначных адносінаў перад насельніцтвам рэспублікі паўстала праблема занятасці і працаўладкавання. Яна не абышла і моладзь. Нават студэнтам эканамічных спецыяльнасцяў не вельмі лёгка знайсці працу, хаця прафесія эканаміста даволі прэстыжная.

Сярод беспрацоўных моладзь складае 48,4%. Наўрад ці ўсе гэтыя людзі не змаглі знайсці працу толькі таму, што аказаліся нікому не патрэбнымі. На нашу думку, праблема ў тым, што маладыя людзі папросту не ўмеюць шукаць працу.

Вырашэнне праблемы працаўладкавання студэнтаў і набору добра падрыхтаваных кадраў для кампаніяў з'яўляецца адным з накірункаў дзейнасці асацыяцыі студэнтаў і маладых спецыялістаў, якія вывучаюць эканоміку і кіраванне, — ЛК AIESEC БДЭУ, якая існуе на базе гэтага універсітэта з 1992 года. Асацыяцыя не займаецца актыўным пошукам працоўных месцаў на прадпрыемствах і ў кампаніях Беларусі, але шэраг мерапрыемстваў, праведзеных ёй, ставіць сваёй мэтай дапамогу студэнтам і маладым спецыялістам у прафесійнай арыентацыі на рынку працы, у супастаўленні сваіх жаданняў з патрабаваннямі працадаўцаў. Штогадовы праект арганізацыі "Дня кар'еры" мае на ўвазе давесці патрабаванні, якія ставяцца да работнікаў працадаўцамі, да шырокай аўдыторыі студэнтаў і выпускнікоў з мэтай спрыяць вырашэнню маладзёжных праблемаў, дапамагчы ў верагодным працаўладкаванні студэнтам і маладым спецыялістам, прыцягнуць увагу грамадскасці, прэсы да праблемы маладзёжнай занятасці.

Напрыклад, у "Дні кар'еры — 96" удзельнічалі больш за 400 студэнтаў і выпускнікоў. Інфармацыя аб іх была прадастаўленая кампаніям — удзельніцам праекта (Procter&Gamble, Coca-Cola Company, Wrigley, Мінскі транзітны банк г.д.). Паводле ацэнкі арганізатараў, прыкладна 20% удзельнікаў знайшлі свае працоўныя месцы, хаця патрабаванні кампаніяў вельмі часта былі занадта высокімі. З другога боку, удзел у праекце дазволіў многім аб'ектыўна ацаніць узровень сваёй падрыхтаванасці, магчымыя перспектывы.

Сёлета аргкамітэт праекта ўдасканаліў канцэпцыю правядзення "Дня кар'еры", каб павялічыць яго эфектыўнасць і для студэнтаў, і для кампаніяў. Мяркуецца ўдасканаліць і пашырыць базу данных, якая будзе ўключаць не толькі студэнтаў, але і маладых людзей да 30 гадоў з эканамічнай адукацыяй. Хаця база данных будзе стварацца да студзеня 1998 года, гэта не значыць, што не варта спяшацца з запаўненнем анкеты: шэраг кампаніяў ўжо зараз жадае набраць маладых супрацоўнікаў.

Са створанай базы данных адбяруць мэтавую групу, для якой спецыялісты агенцтва "Здесь и сейчас" правядуць курс псіхалагічнай падрыхтоўкі. У мэтавую групу выдзелены студэнты старэйшых курсаў і выпускнікі эканамічных спецыяльнасцяў, бо верагоднасць іх працаўладкавання найбольш высокая. Але ўдзелу ў праекце студэнтаў 1-2 курсаў таксама будзе надавацца вялікая ўвага.

Канцэпцыя "Дня кар'еры — 97" прадугледжвае правядзенне прэзентацыі праекта з удзелам прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і грамадскасці на базе БДЭУ. Мэта гэтай акцыі — прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы маладзёжнай занятасці і магчымага шляху яе вырашэння.

Даведацца аб умовах удзелу ў праекце вы можаце непасрэдна ў ЛК AIESEC БДЭУ (Мінск, Партызанскі праспект, 24, корпус 6, пакой 13, тэл. 249-21-39).

*Аляксей СУШКОЎ,*
*віцэ-прэзідент*
*па маркетынгу*
*ЛК AIESEC БДЭУ*



# Каго ж прыходзілі труціць?

Жыву я, як і ўсе іншагароднія студэнты, ў цудоўным камфартабельным інтэрнаце. у якім пры ўсіх яго вартасцях усё ж такі водзяцца прусакі.

Надоечы ўвесь тыдзень у нашым інтэрнаце вісела аб'ява, дзе чорным па беламу было напісана, што ў памяшканнях будзе праводзіцца дэзапрацоўка прусакоў. Для гэтага неабходна прадаставіць доступ у пакоі. Каму застацца? Пры выбары кандыдатуры спыніліся на маёй. Матывавалася гэта тым, што я ўжо на другім курсе і мне можна прапускаць калі-нікалі лекцыі.

Тут усё і пачалося. Я дагэтуль думаю, што ва ўсім вінаваты лік 13, хаця і быў гэта панядзелак, а не пятніца. Дастаўшы ўсё з шафаў і тумбачак, я, як належыць узорнаму барацьбіту супроць прусакоў, прыняла вахту з 9 гадзінаў раніцы. У аб'яве было напісана, што дэзапрацоўка пачнецца ў 9, а калі скончыцца — невядома.

"Атручвальнікі прусакоў" прыйшлі каля 13 гадзінаў. (Заўважце, што гэта даволі дзіўна: 13-га, панядзелак, прыйшлі ў 13 гадзінаў, ды я яшчэ і жыву ў пакоі № 813.) Адчыніўшы дзверы пасля грукату, я ледзь не спалохалася. Там стаялі два чалавекі незразумелага полу ў белых халатах. Белыя шапачкі, насунутыя на бровы, стваралі ўражанне, што гэтыя людзі прыйшлі на нейкую аперацыю. Пры іх застрашальным выглядзе было нечаканым пачуць пранізлівы жаночы голас: "Прусакі ёсць?" І не чакаючы адказу, яны увайшлі ў пакой.

З сабой яны зацягнулі нейкі агрэгат (у мяне ў дзяцінстве была пырскаўка накшталт гэтай). Не шкадуючы раствору, палівалі ўсё наўкол, пачынаючы ад шафаў і заканчваючы падлогай. Сумленна выканаўшы сваю працу, "прусачыныя забойцы" пайшлі далей, папярэдзіўшы мяне, што з пакоя трэба абавязкова сысці.

Я зрабіла наадварот. Не таму, што хацела атрымаць асалоду ад гэтага, мякка кажучы, насычанага паху, а таму, што ў мяне папросту не было ключоў, каб зачыніць дзверы. І вось я цэлы дзень разам з прусакамі прымала іх цяжкое наканаванне.

На наступны дзень я проста не магла ўзняцца: моцна балела галава і кожныя пяць хвілінаў мяне ванітавала. Шчыра кажучы, мне было шкада не толькі сябе, але і гэтых бедных маленькіх насякомых. Можа, яны пакутуюць гэтак жа сама?..

Назаўтра я ўжо так не думала. Мае старыя сябры, прусакі, поўзалі па ўсім пакоі, а я цэлы тыдзень хадзіла як сонная муха. Я і дагэтуль думаю: каго ж прыходзілі труціць?..

*Таццяна МІТЧУРОВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі*



# Новыя даведнікі

*Бібліятэка сучаснага універсітэта ўяўляе з сябе асацыяцыю некалькіх бібліятэк — навуковай, навучальнай і мастацкай літаратуры. Але ў кожным разе неад'емнай часткай яе фондаў з'яўляюцца даведнікі.*

*Фундаментальная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта надае фармаванню і абнаўленню фонду даведачных выданняў вялікую ўвагу. Гэтая літаратура розніцца і па тэматыцы, і па тыпу выдання: у бібліятэцы ёсць агульныя і галіновыя энцыклапедыі, тлумачальныя, тэрміналагічныя, энцыклапедычныя, моўныя слоўнікі, агульныя і галіновыя даведнікі, календары і г. д.*

*Сёлета нашыя фонды папоўніліся новымі даведнікамі, пра некаторыя з іх варта пагаварыць больш падрабязна.*

ЭНЦИКЛОПЕДИЯ ЛИТЕРАТУРНЫХ ГЕРОЕВ (М., 1997). Яна змяшчае інфармацыю пра асноўных перасанажаў сусветнай літаратуры ад антычнасці да нашых дзён. Гэта першае ў Расіі выданне такога кшталту. Энцыклапедыя змяшчае каля 900 артыкулаў, кожны з якіх раскрывае мастацкі сэнс вобраза літаратурнага героя, падае сціслую бібліяграфію.

БУЛГАКОВСКАЯ ЭНЦИКЛОПЕДИЯ (М., 1996). Другая ў расійскай гісторыі энцыклапедыя пасля "Лермантаўскай".

500 МАСТЕРОВ ЗАРУБЕЖНОЙ КЛАССИКИ: АРХИТЕКТУРА, ДЕКОРАТИВНОЕ ИСКУССТВО: ЭНЦИКЛОПЕДИЯ (М., 1995). Падобная энцыклапедыя выдаецца на тэрыторыі СНД упершыню. Яе асноўная частка — 500 размешчаных у алфавітным парадку біяграфіяў выдатных майстроў архітэктуры, жывапісу, графікі, скульптуры. Багата ілюстраваныя артыкулы ахопліваюць найбольш яскравыя з'явы сусветнай мастацкай культуры да канца XIX стагоддзя. Блок артыкулаў-біяграфіяў дапоўнены гласарыем — кароткім слоўнікам мастацтвазнаўчых тэрмінаў, а таксама ўказальнікам узгаданых у энцыклапедыі помнікаў архітэктуры і анатаваным пералікам найбуйнейшых мастацкіх музеяў свету.

ПОЛИТИЧЕСКИЕ ПАРТИИ РОССИИ. КОНЕЦ XIX — ПЕРВАЯ ТРЕТЬ XX ВЕКА: ЭНЦИКЛОПЕДИЯ (М., 1996). Гэтае выданне змяшчае больш за 900 артыкулаў, з якіх больш за 130 прысвячаецца гісторыі палітычных партыяў. Фотаздымкі прадстаўнікоў гэтых партыяў займаюць 70 старонак кнігі.

БИОЛОГИЧЕСКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1995, рэпрынтнае выданне 1989 г.).

МАТЕМАТИЧЕСКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1995, рэпрынтнае выданне 1988 г.).

ФИЗИЧЕСКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1995, рэпрынтнае выданне 1983 г.).

МИФОЛОГИЯ: ИЛЛЮСТРИРОВАННЫЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1996). Гэтае выданне — спроба адвольнага і сістэматызаванага выкладу міфалагічнай творчасці розных народаў свету.

ФИЛОСОФСКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1997). Гэты слоўнік змяшчае больш за 3500 артыкулаў, якія раскрываюць змест найважнейшых паняццяў усіх галінаў філасофіі: гнасеалогіі, метафізікі, псіхалогіі, этыкі, эстэтыкі, філасофіі права, гісторыі філасофіі, рэлігійнай філасофіі і г.д. Гэта першая ў Расіі за апошнія 75 гадоў спроба даць аб'ектыўную карціну філасофіі ад часоў антычнасці да нашых дзён. Вялікая ўвага надаецца аднаўленню імёнаў многіх незаслужана забытых рускіх філосафаў.

РУМЯНЦЕВ О.Г., ДОДОНОВ В.Н. ЮРИДИЧЕСКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1997). У слоўніку тлумачыцца больш за 1500 найбольш распаўсюжданых прававых паняццяў, вядомых сучаснай юрыдычнай навуцы і практыцы. У ім прадстаўленыя ўсе асноўныя галіны права. Артыкулы размяшчаюцца ў алфавітным парадку і ў неабходных выпадках утрымліваюць спасылкі на адпаведныя нарматыўна-прававыя акты Расійскай Федэрацыі.

РАЙЗБЕРГ Б.А. И ДР. СОВРЕМЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ (М., 1997). У слоўніку падаецца больш за 10 000 тэрмінаў, якія ахопліваюць агульнаэканамічныя, бюджэтныя, фінансавыя, валютныя, падатковыя пытанні, кіраванне, страхаванне, бухгалтарскі ўлік, аўдыт, статыстыку, менеджмент, маркетынг і інш.

РУССКИЙ БИОГРАФИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ: РЕПРИНТНОЕ ВОСПРОИЗВЕДЕНИЕ ИЗД. 1896 г. (М., 1992). Гэты слоўнік — найлепшы шматтомны даведнік па рускай гісторыі ад хрышчэння Русі да пачатку гэтага стагоддзя. Тут падаюцца біяграфіі дзяржаўных дзеячаў, навукоўцаў, пісьменнікаў, журналістаў, духоўных асобаў, дактароў, інжынераў, падарожнікаў, мастакоў, прадстаўнікоў знакамітага купецтва. Большасць біяграфіяў чытаецца як бліскучыя нарысы. Пры гэтым усе яны пабудаваныя на ўпершыню апублікаваных матэрыялах расійскіх архіваў. Па сутнасці, гэта нацыянальны біяграфічны слоўнік. Зараз у бібліятэцы ёсць толькі 8 з 33 тамоў гэтага слоўніка.

ПОЛИТОЛОГИЯ: КРАТКИЙ ЭНЦИКЛОПЕДИЧЕСКИЙ СЛОВАРЬ-СПРАВОЧНИК (М., 1997). Даведнік дае вызначэнні асноўных тэрмінаў паліталогіі, раскрывае сэнс базавых катэгорыяў, знаёміць з вядомымі палітолагамі Расіі і свету.

СУДЛЕНКОВА О.А., КОРТЕС Л.П. 100 ПИСАТЕЛЕЙ ВЕЛИКОБРИТАНИИ (Мн., 1997). Выданне змяшчае артыкулы і даведкі аб буйнейшых пісьменніках Вялікабрытаніі. Называюцца іх асноўныя творы і пераклады. Тэкст дапаўняюць літаратурныя ілюстрацыі і фотаздымкі. Напрыканцы падаецца алфавітны паказчык прозвішчаў пісьменнікаў па-англійску. Выданне з'яўляецца першым у Беларусі бібліяграфічным даведнікам пра буйнейшых празаікаў, паэтаў, драматургаў Вялікабрытаніі, пачынаючы ад пісьменнікаў Сярэднявечча.

ШКОЛЫ И ВУЗЫ ЕВРОПЫ И АМЕРИКИ: СПРАВОЧНИК-ДАЙДЖЕСТ (М., 1997). У даведніку падаюцца звесткі аб навучальных установах Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Швейцарыі і ЗША, асаблівасцях падрыхтоўкі ва універсітэты і каледжы, аб моўных курсах. Прыводзяцца асноўныя звесткі, адрасы і тэлефоны прадстаўніцтваў замежных навучальных установаў у Расіі, а таксама расійскіх і замежных фірмаў, якія працуюць на расійскім адукацыйным рынку. Апрача таго ёсць раздзел "Адукацыйныя праграмы і стыпендыі".

ВСЕ БЕЛОРУССКИЕ ФИЛЬМЫ: Т.1: ИГРОВОЕ КИНО (1926-1970): КАТАЛОГ-СПРАВОЧНИК (Мн., 1996). Гэтае выданне — гісторыя беларускага кіно ў фактах. Першы том змяшчае поўнае фільмаграфічнае апісанне беларускіх ігравых фільмаў. Падобнае выданне ажыццяўляецца ўпершыню. Апісанне кожнага фільма ўключае поўную фільмаграфію, анатацыю, ілюстрацыі, звескі аб прэміях і ўзнагародах, фрагменты публікацыяў (рэцэнзіі, артыкулы, кнігі), якія адлюстроўваюць лёс фільма.

*З усімі гэтымі даведнікамі вы можаце пазнаёміцца ў даведачна-бібліяграфічным аддзеле і чытальных залах бібліятэкі.*

*А.В. БУЦІНА,*
*заг. аддзела*
*камплектавання*
*і каталагізацыі*
*фондаў бібліятэкі БДУ*

# Прэс-канферэнцыя студэнткі

Вядома, што, каб чаму-небудзь навучыцца, адной тэорыі малавата, патрэбна практыка. Гэта ж датычыцца і журналісцкай працы. Нездарма ж нашая выкладчыца па спецыялізацыі (журналісцкай творчасці), а таксама прафесійная журналістка Таццяна Уладзіміраўна Падаляк прымушае нас адшукваць тэмы нават там, дзе, на першы погляд, нічога цікавага няма. Здаецца, што можна напісаць аб бачным з акна аўдыторыі? Выявілася, што можна, і даволі цікава, калі ёсць жаданне.

Калі ж мы праходзілі тэму "Інтэрв'ю", заняткі былі зусім незвычайнымі: Таццяна Уладзіміраўна прапанавала нам правесці прэс-канферэнцыю ў межах сваёй групы. Вядома, для гэтага быў патрэбны смяльчак, падрыхтаваны для таго, каб годна "адбівацца" ад каверзных пытанняў.

На прапановы выкладчыцы хлапечая галёрка адказала дружным маўчаннем, як і ўся група. І тут з першай парты раздаўся звонкі дзявочы галасок: "Я!" Галасок належаў Кацярыне Абельскай — сімпатычнай невысокай дзяўчыне з прываблівай усмешкай. Прашу звярнуць увагу на гэтае імя і запомніць яго, бо калісьці яно, на маю думку, стане славутым.

Таварышы-журналісты адразу ж накінуліся на яе з пытаннямі: "Як ты ставішся да арганізацыі па ахове хатніх жывёлаў "Каштанка"?" Канешне ж, Каця салідарызавалася з "Каштанкай" і іншымі арганізацыямі гэтага накірунку, бо вельмі любіць і шкадуе "братоў нашых меншых". Яна нават лічыць, што жывёлы нашмат разумнейшыя за людзей, бо не прыносяць шкоды навакольнаму свету. А ў нас, на думку Каці, закладзеная праграма разбурэння, што прывядзе некалі да гібелі планеты. Аднак дзяўчына прымае гэта як непазбежнае і таму ставіцца спакойна: "Такімі мы створаныя, і ў гэтым ёсць свой сэнс. Нічога ў свеце не бывае без сэнсу, проста так, хоць нам часам не ўсё здаецца зразумелым".

Адразу ж узнікла пытанне пра сэнс жыцця, на якое Каця адказала проста: "Сэнс жыцця ў тым, каб жыць". Яна не песіміст па натуры, а, паводле яе ўласных словаў, "песіміст у шырокім маштабе". Нягледзячы на веру ў канец свету яна вельмі любіць жыццё, людзей, сваю прафесію.

А пра што ж яна марыць? Аказваецца, у дзяцінстве Каця марыла стаць спярша ветэрынарам, а потым — касманаўтам. Чаму? Па-першае, у маленстве яна вельмі любіла ежу з цюбікаў, а па-другое, хацела адчуць, што такое палёт, бязважкасць, свабода.

Свабода і незалежнасць ёй патрэбны і цяпер. А дасягнуць іх можна з дапамогай вялікай колькасці грошай. Вось тут вы і параўнаеце Кацю са сквапным таўстасумам, што будзе зусім несправядліва. Каця марыць павандраваць па свеце. А як павандруеш, калі няма за што купіць білет на самалёт? Не пойдзеш жа пехатой у Акапулька!...

Другая мэта яе жыцця — кар'ера. На пытанне, ці кіне яна журналістыку, калі ў яе будзе ўсё, што яна захоча, Каця адказала: "Не, таму што гэта мне падабаецца і прыносіць задавальненне". Бывае, Кацю апануваюць страх і нерашучасць. Аднак яна амаль навучылася кіраваць гэтым. Калі ўзнікаюць сумненні, сама сабе кажа: "А што будзе, калі я не спалохаюся?" Простыя словы, але якую падтрымку і зарад упэўненасці яны ў сабе нясуць.

Гутарка атрымалася настолькі цікавай, што пытанні сыпаліся як з мяху. Але званок абвясціў сканчэнне нашай "прэс-канферэнцыі". Яна дала нам не толькі магчымасць папрактыкавацца ў правядзенні інтэрв'ю, але і даведацца шмат цікавага аб аднакурсніцы.

*Людміла АЛЕСІК,*
*студэнтка*
*факультэта*
*журналістыкі*

*Диана БАЛЫКО, студентка белорусскоязычного отделения исторического факультета*

***

Сохрани мои стихи.
Все до строчки, все до слова,
Чтоб однажды вспомнил снова
Мои легкие шаги.
Сохрани мои стихи...

Сбереги мою любовь.
И когда ее не будет,
Твое сердце не забудет
И проснется нежность вновь.
Сбереги мою любовь...

Защити мои глаза
От горячих слез соленых.
Ты ведь был в меня влюбленным.
Унесла любовь гроза.
Защити мои глаза...

Огради меня от боли.
Все, что должен мне, отдай,
Не суля ни ад, ни рай.
Ведь не любим мы в неволе.
Огради меня от боли...

Ты прости меня за грех,
Что останусь самой лучшей,
Самой искренней из всех,
Самым чистым был мой смех.
Ты прости мне этот грех...

***

В парке зажглись фонари —
Красные гроздья рябин.
Мне не уснуть до зари,
Зная, что ты не один,
Зная, что ты не со мной
Делишь осенний рассвет.
Я поделюсь с луной
Счастьем, которого нет.
Я напишу стихи...
Что разделило нас?
Были не встречи — штрихи.
Листья танцуют вальс.
Ветер поет за окном
Мне колыбельную песню.
Грустно быть с ветром вдвоем,
Зная, что солнце есть.
Ты обещал писать,
Ты обещал звонить.
Я не умею ждать —
Рвется тонкая нить.
Время бежит вперед:
В прошлом летний роман.
В кровь закусила рот:
Может, любовь — обман?

### Лейпциг

В центре Лейпцига звонят колокола
Дон-дон.
Вспоминается родная мне земля
Тон в тон.
Если б я сейчас на Родине была
День в день,
Обняла б березы я и тополя,
Как тень.
Ветер свежий здесь, а все же чужой —
Бог весть.
А у старой церкви купол золотой
И крест.
Но судьба моя на минской земле —
Верна.
И зовет меня в небесной золе
Луна.

*Прапануем вам вершы сёлетняга выпускніка нашага універсітэта, нашага сталага аўтара, які друкуецца пад псеўданімам FRA NIAT*

### Герда ищет Кая
*(из Г.-Х. Андерсена)*

Л.О.

Бреду по белу свету,
И ночь сменяет день,
И мчит меня от лета
Большой чудной олень.

Бреду по белу свету —
Не страшно мне ничуть.
Здесь сердце бьётся где-то
И ищет нужный путь.

От тёплого камина
До ледяных дворов
Раскинулась долина
Из беспокойных снов.

Мне здесь — лихая вьюга:
Искать открытой дверь
Из замкнутого круга —
Ему — творенье фей.

Я днём бегу навстречу
Туманам и снегам,
Но день сменяет вечер,
И я — опять одна.

Ведь ночью злая вьюга
И белая метель
Уносят голос друга
За ледяную дверь.

Кружит над миром ветер,
И скачет вершью день...
С бумаги чёрных литер
Блестит немая тень:

"Прощание — ужасно.
Сказать не мог я слов.
Своею личной властью
Покинул я наш кров.

Волшебными лучами
Согрет среди снегов,
И чёрными очами
Ведом в пустыне льдов.

Здесь замок есть прекрасный,
Дворец створён со льда,
Метель бушует страстно
И белая луна —

Не как луна у дома:
Бездушна и глуха —
Прозрачная корона:
Наивна и легка.

Здесь гордая царица
Живёт в своём дворце.
У ней есть маски-лица
Животных и людей.

Реальность зимней сказки
В обыденной поре
И ледяные краски
На ледяном ковре.

Прощай, не плачь, не надо.
Сотри свою слезу."
— Который месяц кряду
За тенью я бреду.

Бреду одна по миру,
Как рыжая лиса,
Чтобы взглянуть правдиво
В бездушные глаза.

В руках — клочки бумаги,
На щёках — грязь от слёз.
И я забыла саги
Про мир девичьих грёз.

Над серым горизонтом
Летает пустота.
И раз, наверно, в сотый
Бьёт правда: я — одна!

Но отыщу ту землю,
Где властвует лишь лёд.
В себя я только верю,
Найду Судьбе назло!

***

Л.О.

Повисло над городом лето,
И где-то лютуют дожди.
Склонясь над полоскою света,
Ты грустные пишешь стихи.

У лампы — чернильница, перья,
Конспекты лежат невпопад...
И странная дивная вера
В старинный сакральный обряд

Змейкою дремлет на пальце.
В бумаге — прозрачная даль:
Седые, но мудрые старцы
Тебя приглашают на бал

И просят лишь: "Нежная фея,
Не плачь никогда, не грусти,
Больно ли, или потеря
Сердце сжимает в груди.

Храни свою жизнь и счастье,
Так нужные детям, друзьям.
А за удачу в ненастье
В келье помолится фра.

Как Золушка, ты — королева
В блистающих сказкой дворцах.
Комок обезумевших нервов
Растает в горящих свечах.

Люби, госпожа, неустанно
Любовью, где кровь или плоть.
В кумирнях, церквях и собраниях
У ней лишь священная суть..."

И молвили старцы о многом,
Они Твоё имя рекли:
Имя, воспетое Богом,
Владычицы Русской Земли...

Ночь подкатилась к исходу,
Рассвет облизал небеса.
Стихи, как красивые ноты,
Пером по бумаге скрипя,

Рождаются. Страсть, расставание —
Есть в этих милых строках —
И радости встреч и свиданий,
Слеза на медовых устах...

Выпит кофе из чашки.
Перо — как живое в руке:
Самые разные краски —
Красивые пишешь стихи.

# Дороги

Высокий широкоплечий паренек, которого друзья ласково звали Мишуткой, вышел из вагона, оставив в купе брата-близнеца. Чуть взволнованного, не по характеру растерянного. Чем-то напуганный брат, просунув голову в оконный проем, молча смотрел на Мишутку. Как странно видеть лицо брата без шаловливой улыбки. Но улыбаться не было повода. Впервые за двадцать прожитых лет близнецам приходится надолго расстаться. Такова судьба футболиста. Сегодня — здесь, через год — там. Вновь другой город, чужие лица, новые знакомые. Через два — жизнь еще куда-нибудь забросит. И опять все сначала. Только одно постоянно: игры — тренировки, тренировки — игры. В редкий выходной к родителям выберешься — благодать. А теперь и раз за сезон не всегда получится. Друзей по спортшколе (а других почти нет) так по футбольным адресам разбросало, что только из газет и узнаешь, где кто находится. А вот сейчас брат... Милый, родной, самый близкий человек. Вечный спутник детских шалостей, самый верный товарищ. Мишуткина половина, его второе "я". Поезд тронулся. Мишутка некоторое время шел за вагоном, но перрон вскоре кончился, и пришлось остановиться. Куда теперь? Домой, в общежитие. Куда ж придешь один? Там хоть с Авдеем словом перекинешься.

Прошел день, второй, неделя. В комнате Мишутку перестали называть именем брата, да и общая кличка потихоньку забывалась. К ним заселился паренек из Бреста. И только кипа фотографий напоминала, что здесь когда-то жил белоголовый никогда не унывающий мальчишка — точная копия Мишутки. А Мишутка практически перестал улыбаться. Так, слегка, губами. Когда уж очень смешно. А в глазах поселилась грусть. И как ни старался Авдей разогнать ее, все попытки были безуспешны. Не помогли даже его пресловутые истории, рассказывать которые он был большой мастак. И только один человек мог заставить Мишутку быть прежним. Но он находился в далекой Норвегии. Однако он звонил. Брат звонил почти каждый день. Правда, эти звонки мало радовали Мишутку. Сквозь шутки брата пробивались нотки пугающего одиночества.

И Мишутка грустил еще больше, наматывая целые километры по маршруту "диван — телевизор". Не было брата, который мог бы его стащить с дивана или, наоборот, отговорить от прогулки. Да и куда идти? Только кинотеатр "Москва" — излюбленное место брата, как, впрочем, и многих футболистов. Но там всё напоминает о нем. А больше некуда. За полтора года, которые братья прожили в Минске, они видели город в основном из окна клубного автобуса. Но Мишутке недолго осталось колесить по улицам столицы. Через месяц его продадут в Италию.

*Ольга КОЗДЕРКО*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00.*

*4 СНЕЖНЯ*
*Зак. 1800*
*Т. 1000 экз.*

*Бясплатна*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*